Урывак з мерапрыемства СШ № 172

**“Гісторыя праз лёсы”:**
*Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт*
Урывак з камедыі ***“Пінская шляхта”***

## *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808-1884)*

*Што мне пекны Парыж, Рым прыгожы і слынны,*
*Што швейцарскія горы, старыя Афіны.*
*Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны,*
*Больш за ўс1 я бацькоўскаму краю аддадзены!*
*Тут прывольна і ўтульна на ўлонні прыроды!*
*Тут і птушкі спяваюць прыгожа заўсёды!*
*Тут і сонца на свет весялей паглядае!*
*І любоў гарачэй тут у сэрцах палае!..*
*Тут дзяўчына, што ў свеце няма прыгажэйшай.*
*Тут ёсць праўда і шчырасць, тут людзі з душою!*
*Тут бацькоў маіх прах пад сырою зямлёю!*

Вінцэнт Іванавіч Дунін-Марцінкевіч паходзіў з небагатай беларускай шляхты. За 9 кіламетраў ад Бабруйска быў фальварак Панюшкавічы, дзе яго бацькі, Іван Мікалаевіч Дунін-Марцінкевіч і Марцыяна з Нядзведскіх, арандавалі панскую зямлю.

У Панюшкавічах прайшло яго дзяцінства – на беразе Бярэзіны, сярод прыроды, гульні з сялянскімі дзецьмі. Яны гулялі ў садзе, на лузе, ля кургана і Бярэзіны. Разам з бацькам Вінцук бываў у суседніх вёсках – Сычкава, Шчадкаў, Антонаўка, Лукі, ездзіў на кірмашы. Там чуў жывую сакавітую сялянскую гаворку, народныя песні і прыпеўкі, бачыў танцы і карагоды.

Досыць плённыя для пісьменніка былі 1850-я гады. Адна за адной выходзілі кнігі Беларускага Дудара з творамі на роднай мове.

І песню за песняй парадкам
Пусціў, як жывую крыніцу:
Пасыпаліся, проста як з неба,
“Дажынкі”, “Гапон”, “Вечарніцы”.

Значнае дасягненне беларускай літаратуры камедыя “Пінская шляхта”. Урывак з яе мы з вамі зараз і паглядзім.

***Марыся:*** Цяжка жыці мне, дзяўчаці, з міленькім ў разлуцы, -
Лае бацька, лае маці, што сэрцайка ў скуцы.
Годзі сядзець над прасніцай – я хачу быць маладзіцай!
Маці кажа: век малоды, ой ты яшчэ мала!

А сама ўжо ў гэты годы бацьку пакахала.
Годзі сядзець над прасніцай – я хачу быць маладзіцай!

Ой, так! Няхай ганіць бацька, няхай лае маці, а я люблю Грышку і любіць яго век буду. Ой, бедныя ж нашы галованькі!.. Што ж гэта за дур напаў на бацькоў? П’яныя завяліся ды пабіліся з сабою за шляхецтва, а мы з Грышкам праз тое гаруем і ныем. Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу Найяснейшая Карона на прасоку. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў ногі ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў ды каб яны дазволілі нам пажаніцца. А ён такі сярдзіты, не дапускай ты Бог! Як наставіць адзін вус угору, а другі ўніз, як зіркне адным сваім вокам ды крыкне: “ Па найяснейшаму ўказу!” – то бацькі спалохаюцца ды зладзяць нам вяселле… Ды што гэта зрабілася Грышку? *(Грышка паціху крадзецца да Марысі)* Баюся, каб не папрачыналіся бацькі, нельга было б пабачыцца з ім. Ой, Грышка, Грышка! Ты штось цяпер зрабіўся вельмі лянівы. Табе, пэўна, сэрца цяпер так ужо не ные па мне… Як прыйдзе, дык пакажуся перад ім сярдзітаю, і хоць будзе прасіць і маліць, каб пацалавала, дык не пацалую. Дальбог, не пацалую!

***Грышка:*** Дык я ж і прасіць не буду, сам цябе пацалую. *(Цалуе)*

***Марыся:*** Ах, Грышка нядобры! Як ты спалохаў мяне, гневаюся не жартам!..

***Грышка:*** Гневаешся? Няпраўда! А чаму ж ты на мяне так міленька пазіраеш?

***Марыся:*** Я? Так, са злосці!.. Нягодны, дзе ты забаўляўся? Гэта ж зараз прыйдуць бацькі, а мы так многа маем з табою перагаварыць.

***Грышка:*** Выбачай, мілая Марыся, - чуць золак, я з’ездзіў ужо да места, кінуўся ў ногі асэсару і прасіў, каб ён узяў нас пад сваю апеку.

***Марыся***: Што яго прасіць з голымі рукамі? Трэба было завесці які гасцінчык.

***Грышка***: Дык я ж завёз яму двух зайцоў, тры пары цецерукоў ды лубку мёду. Ён усё прыняў ласкава і сказаў, што сёння ж ранкам прыедзе на разборку справы майго бацькі з тваім. Ой, наварылі бацькі сабе кашы, будзе што есці! Ён вельмі сярдзіты – як размаўляў, дык адзін вус калом угору і стаў. Будзе вазня!

***Марыся:*** Дай Бог, каб гэта каша нам зубоў не папрышчыла!

***Грышка***: Ён дакляраваў зрабіць нам вяселле. На Богу ды на ім – уся наша надзея.

***Марыся:*** Паклаўшы надзеі на Бога, чаго ж гараваць?

***Грышка:*** Прысяглі любіць да гроба, - дык будзем жа ждаць.*(абдымаюцца)*

***ЦІХОН:*** Хрэн табе ў вочы! Жонка, а жонка! Хадзі ды паўзірайся, як дачка твая з Грышкам Цюхайчыкам галубіцца!

***КУЛІНА***: Хто? Дачка? Бойся Бога, ды яна ж яшчэ малая!

***ЦІХОН:*** Які чорт малая! Хрэн табе ў вочы, хадзі палюбуйся!

***Марыся:*** Якая ж я малая, калі мне на Спаса скончыцца сямнаццаць год?!

***КУЛІНА:*** Маўчы ты, хітрая лісіца! Бачыш ты, як яна скора палічыла гады!

***ЦІХОН:*** Ах ты, чортаў сыну! Хрэн табе ў вочы! Не годзе таго, што бацька да жывога мяне пакрыўдзіў, назваўшы не шляхціцам, дык яшчэ сынок дачку нам баламуціць.

***Грышка:*** Ды я ж яе люблю і хачу з ёю жаніцца…
***ЦІХОН:*** Ось я цябе так пажаню, як твайго бацьку! Жонка, а жонка! Дай мятлу! Хрэн табе ў вочы!
***Грышка:*** Што хочаце, тое рабіце, а ўсе-такі Марыся будзе мая! (Да Марысі) Бывай здарова! (*Выходзячы, спатыкаецца і збівае з ног Куторгу*)
***Куторга***: Ах ты, паганец! Збіў мяне з ног! Я табе не дарую гэтай штукі! Дзень добры, пане! А я к вам з вялікаю навінаю. Не ведаеце? Толькі што пан асэсар прыехаў, ды такі сярдзіты!
***ЦІХОН:*** Хрэн яму ў вочы! Будзе бяда, будзе! Гэты сабака Ліпскі падаў на мяне ў суд. Абдзяруць, як ліпку! Пан Куторга! Ты ж такі пісьменны чалавек – можаш падаць мне разумную раду.
***Куторга***: А прыміце маіх сватоў да вашай Марысі.
***Куліна:*** Бойся Бога, пане Куторга, яна ж яшчэ маладзенькая! Гэта ж дзіця горкае!
***ЦІХОН:*** Які чорт дзіця, калі з хлопцамі цалуецца! Добра, пане Куторга, - бяры сабе дачку, толькі выцягні з бяды.
***Куторга***: Не жаль для Марысі скрывіць душою. Хоць я і не бачыў, але скажу, што гэта ён цябе біў, а не ты яго. Толькі прышліце сюды Марысю, каб я мог угаманіць дурную, каб не цуралася разумнага чалавека. (*Бацькі пайшлі, прыбягае Марыся*). Дабрыдзень панна Мар’яна!
***Марыся:*** Дабрыдзень, пан Куторга!
***Куторга:*** А як панна Мар’яна прыгожа выглядае, які свежы тварык. Я чакаў шчаслівага моманту, каб пацалаваць беленькую ручку панны. *(Яна абцірае сваю руку*). Панна Мар’яна! Вы не чуеце, вы не ведаеце, як я вас крэпка люблю. І ні ўдзень, ні ўночы не маю спакою…
***Марыся:*** Гэта ад старасці, пане Куторга! Пара пра дзяўчат перастаць думаць, а маліцца Богу, каб даў забвенне.
***Куторга:*** Буду крэпка ця любіці, век табе верай служыці. Малады ж часта няшчэры, не шукай ў ём добрай веры.
***Марыся:*** Да што мне з мужа старога?! Я хачу майго мілога, бо стары, заміж гуляці, будзе кашляць і стагнаці. Грышка мой – хлапец матарны, малады, відны ды гарны. Глянь! Душа к яму ірвецца і сэрцайка мацней б’ецца.
***Куторга:*** Але Грышка твой няшчэры, не шукай ў ём добрай веры! Пры табе – табе кланяецца, а з другой – з цябе смяецца. *(Марыся засмяялася і ўцякла)*

Што адбылоя далей – вы пазнаеце, калі возьміце ў рукі камедыю “Пінская шляхта”. Высокае майстэрства Дуніна-Марцінкевіча-драматурга, якое выявілалася ў цікавым, займальным сюжэце, жывых характарах, умелым выкарыстанні багацця ў народнай мовы, вызначыла гэтаму твору доўгае жыцце. “Пінская шляхта” і цяпер з поспехам ставіцца на сцэне.У цэнтры Мінска адкрыты помнік Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу і яго сябру, кампазітару Станіславу Манюшку.

*Загадчык бібліятэкай*
*ДУА “СШ № 172 г.Мінска”*
*Еўсіевіч Т.А.*